■ 50+

ДЗЕ ШУКАЦЬ ЭЛІКСІР МАЛАДОСЦІ

Чатыры пажылыя жанчыны, у кожнай з якой за плячыма свая гісторыя жыцця, п'юць гарбату за сталом, гартаюць часопісы і вядуць ажыўленую гутарку. Пра што могуць размаўляць на пенсіі кабеты з такімі рознымі лёсамі і інтарэсамі? Ды пра ўсё! І не толькі размаўляць, але і ажыццяўляць тое, на што не хапіла часу ў маладосці.

Жыццё толькі пачынаецца

Для гэтых пенсіянерак жыццё з выхадам на заслужаны адпачынак зусім не скончылася. Скаргі на лёс у калідорах паліклінікі (хоць гэтую ўстанову ўсё ж даводзіцца наведваць у сувязі з узростам) і плёткі на лавачках ля пад'ездаў не для іх. Навошта губляць на гэта час, калі менавіта цяпер можна заняцца тым, што сапраўды падабаецца? Для гэтага і прыходзяць у тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна сталіцы. Менавіта тут яны займаюцца ў гуртках, а нядаўна пачалі наведваць аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту, што запрацавала пры цэнтры ў канцы лістапада. Кожны дзень тут збіраецца да дзясятка чалавек, каб абмяняцца вопытам і проста цікава правесці час.

Як выйшла на пенсію, падумала: я ж яшчэ маладая.

Усё жыццё Антаніна Раманаўна Шакун працавала ў бібліятэцы Інстытута матэматыкі Акадэміі навук. Цяпер, у 77 гадоў, жанчына захапляецца вандроўкамі па Беларусі і свеце, а таксама любіць праглядаць навіны ў сеціве. З жадання не адставаць ад сучасных тэхналогій усё і пачалося.

— Неяк зайшла, каб атрымаць інфармацыю пра камп'ютарныя курсы, і даведалася, што на базе цэнтра адкрываецца аддзяленне дзённага знаходжання, — распавядае Антаніна Раманаўна. — Чым мы тут займаемся? Усім! Але па-сапраўднаму яшчэ толькі фарміруемся.

Сапраўды, работа аддзялення плануецца паводле пажаданняў наведвальнікаў літаральна «на хаду». Тут усё проста і па-сяброўску, нефармальна: нехта прапаноўвае тэму, і, п'ючы гарбату (нярэдка са спечанымі ўласнаручна пірагамі), жанчыны пачынаюць абмяркоўваць яе, дзелячыся сваімі ведамі і вопытам. Праводзяцца тут і тэматычныя гутаркі па розных пытаннях — адно з самых актуальных, вядома, здароўе. А напярэдадні Новага года кабеты арганізавалі кулінарны тыдзень, падчас якога дзяліліся любімымі рэцэптамі і рознымі хітрыкамі па прыгатаванні смачных страў.

«Я ж яшчэ маладая!»

67-гадовая Марыя Іванаўна Марціновіч ужо два гады ходзіць у клуб падарожнікаў пры цэнтры, дзе наведвае экскурсіі па Беларусі і не толькі. Апошнія 20 гадоў перад пенсіяй жанчына працавала выкладчыкам гісторыі ў вучылішчы, выхоўвала будучых будаўнікоў.

— Як выйшла на пенсію, падумала: я ж яшчэ маладая, павінна нечым займацца, — кажа Марыя Іванаўна.

Гэтыя думкі прывялі яе ў гандаль. Скончыла вячэрнія курсы, атрымала разрад і працавала прадаўцом у краме. Пасля разносіла газеты на пошце, аднак па стане здароўя давялося пакінуць працу. Але нязгаснае жаданне нешта рабіць прывяло спадарыню Марыю ў аддзяленне дзённага знаходжання.

— Самае галоўнае тут — стасункі з людзьмі, — лічыць пенсіянерка. — І падчас сустрэч тут я адчуваю такое адухаўленне, заўжды знаходжу нешта новае і цікавае!

Некалькі гадзін на дзень, што пажылыя людзі праводзяць у аддзяленні, даюць ім магчымасць знайсці цікавых суразмоўцаў, абмяняцца інфармацыяй і ўзаемаўзбагаціцца. А таксама праявіць сябе ў творчасці: на святы яны праводзяць канцэрты, дзе спяваюць, танцуюць і ладзяць розныя конкурсы. Але самадзейнасць не застаецца толькі ў межах адной установы: са святочнай праграмай жанчыны ўжо наведалі сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Кастрычніцкага раёна.

Паспець за часам

Дзіяна Піліпаўна Пятроўская ўсё жыццё працавала ў Міністэрстве сувязі. Цяпер ёй 67 гадоў, але жанчына працягвае падпрацоўваць у будаўнічай арганізацыі. Муж Дзіяны Піліпаўны пайшоў з жыцця, дзяцей у іх не было. Каб не сумаваць, пенсіянерка купіла сабе ноўтбук, падключыла інтэрнэт.

— Яшчэ не ўсё ведаю ў камп'ютары, баюся націснуць нешта не тое, таму ў аддзяленне трапіла таксама дзякуючы аб'яве пра камп'ютарныя курсы. Я сюды прыходжу і атрымліваю карысную інфармацыю. Тут заўжды нешта падкажуць. Гару ўсёй душой!

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

А «танцаўшчыца і пявуння», як кажуць пра яе каляжанкі, Людміла Уладзіміраўна Опра 12 студзеня адзначыла 78-годдзе. Два разы на тыдзень жанчына займаецца гімнастыкай, і нават сесці на шпагат у такім пачэсным узросце для яе зусім не цяжка. Апроч спорту, Людміла Уладзіміраўна спявае ў караоке пры цэнтры, наведвае заняткі псіхалагічнай групы і клуб падарожнікаў.

— Я тут знаходжу эліксір маладосці! — заяўляе жыццярадасная жанчына.

Апроч таго, што клубы па інтарэсах існуюць пры цэнтры сацабслугоўвання, на базе аддзялення таксама пакрысе распачынаюць працу некалькі гурткоў: спачатку па вязанні, крыху пазней — доўгачаканыя камп'ютарныя курсы. Але адукацыйны момант тут займае другаснае становішча.

— Такія ўстановы, як наша, неабходны ў першую чаргу для стасункаў, — упэўнена **загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Людміла РАШЧЭНЯ.** — Тут людзі могуць паразмаўляць пра сваё жыццё. Магчымасць кантактаваць асабліва важная ў сталым узросце, яна стымулюе дзейнасць мозга. Актыўная мазгавая дзейнасць, у сваю чаргу, — гэта прафілактыка інваліднасці і зніжэнне верагоднасці ўзнікнення хваробы Альцгеймера.

Два разы на тыдзень жанчына займаецца гімнастыкай, і нават сесці на шпагат у такім пачэсным узросце для яе зусім не цяжка.

Усе кабеты, што наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання, перажылі свае перамогі і, вядома, свае горкія страты. У кагосьці з іх ёсць дзеці і ўнукі, але ім часта не хапае часу, каб праведаць бабулю. А нехта застаўся зусім адзін альбо мае дрэнныя стасункі з членамі сям'і. І тут жанчыны знаходзяць тое, што дае ім магчымасць пражываць жыццё напоўніцу нягледзячы на павароты лёсу. А яшчэ зразумець: час ідзе, але гэта значыць не тое, што большая частка жыцця засталася ў мінулым, а тое, што трэба яшчэ шмат чаго паспець у будучыні.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

■ Чытачы — супраць

ЧАМУ ВЫРАШЫЛІ ЗАКРЫЦЬ БІБЛІЯТЭКУ?

Жыхары Магілёва спадзяюцца, што рашэнне аб закрыцці дзіцячай бібліятэкі будзе адменена

З першага студзеня на дзвярах дзіцячай бібліятэкі імя Максіма Горкага, якая знаходзіцца ў абласным цэнтры на вуліцы Аўтазаводскай, з'явіўся замок — яна больш не працуе. Але жыхары раёна, чые дзеці наведвалі гэтую ўстанову, з такім становішчам мірыцца не жадаюць. Пад зваротам, які прынесла ў карпункт «Звязды» Ала Няўмоева, паставілі свае подпісы амаль пяцьдзясят чалавек. Яны хочуць, каб недарэчнасць з іх бібліятэкай была выпраўлена. Дарэчы, восем гадоў таму ўжо была спроба закрыць яе, але чытачы перамаглі.

Ала Няўмоева — жанчына рашучая, гатовая ісці ў сваёй справе да канца. Яна абышла шмат розных інстанцый, адправіла звароты ў некалькі міністэрстваў і КДК. Жанчына ўпэўнена, што справу яшчэ можна выправіць. Тым больш, што ў сваіх імкненнях яна не адзінокая. «Сюды хадзілі нашы дзеці, потым унукі, а зараз што ім рабіць? — пытаецца яна. — Раней на кожным кроку адкрывалі хаты-чытальні, а зараз прывіваць любоў да чытання не патрэбна?»

Бібліятэка, за якую сёння пачалася сапраўдная вайна, існавала ў Магілёве амаль 60 гадоў, на яе кнігах вырасла не адно пакаленне чытачоў. Асноўныя яе наведвальнікі — дзеці 7-15 гадоў, якія, нягледзячы на спакусы ў выглядзе інтэрнэту і іншых электронных гаджэтаў, прыходзілі сюды.

Чаму вырашылі закрыць бібліятэку? Паводле статыстыкі, на момант закрыцця ўстановы яе паслугамі карысталіся каля тысячы чытачоў. Па існуючых нормах, гэта ў 5 разоў менш, чым патрэбна. А выдаткі на ўтрыманне не маленькія. Замест бібліятэкі з'явіцца мастацкі клас. А кнігі (дарэчы, фонд складае больш за 26 тысяч асобнікаў) перададуць бібліятэцы № 9, якая знаходзіцца на праспекце Дзімітрава.

Але, як кажа Ала Няўмоева, да той бібліятэкі — шэсць прыпынкаў язды на гарадскім аўтобусе ды яшчэ небяспечны пераход цераз дарогу, дзе часта адбываюцца ДТЗ. Не ўсякія бацькі яшчэ і пусцяць туды сваё дзіця. У мікраёне ёсць бібліятэка ад аўтазавода імя Кірава, але там нават адмовіліся прымаць дзіцячыя кнігі: нельга, установа ведамасная. Ёсць яшчэ адзін варыянт. Для чытачоў прапанавалі арганізаваць «стол заказаў» на неабходную літаратуру пры бібліятэцы СШ № 7, які будзе працаваць 2 разы на тыдзень. Але, як абураецца адна з «пацярпелых» маці, падвоз літаратуры не вырашае пытання, бо калі ты хочаш выбраць кнігу «для душы», то яе трэба не «замовіць», а перш за ўсё ўбачыць, патрымаць у руках, зразумець, ці хочацца табе яе прачытаць.

Пачуцці людзей, якія хвалююцца за лёс сваёй бібліятэкі, зразумелыя: бацькі былі спакойныя за сваіх дзяцей. І не толькі таму, што падлеткаў тут дрэннаму дакладна не навучаць. Ёсць нешта іншае, тое, што нельга ўбачыць. Я і зараз, здаецца, адчуваю пах бібліятэкі, дзе так падабалася бываць у дзяцінстве. Ёсць нейкая магія менавіта ў самім існаванні папяровага царства — магчымасць перабіраць кніжкі на палічцы, гартаць падзёртыя часам старонкі, глядзець на малюнкі, выхопліваць вачыма нейкія словы з кантэксту. У гэтых вельмі спрыяльных умовах маленькі чалавек вучыцца прымаць рашэнні, рабіць выбар, у яго з'яўляецца густ. Нездарма ж кажуць: добрая кніга адбівае інтарэс да дрэннай. А яшчэ сёння гэта адно з нешматлікіх месцаў, дзе за паслугі не трэба плаціць.

«Мы з сябрамі часта наведваліся ў нашу бібліятэку. Асабліва зімой. На стадыёне, каб пакатацца на каньках, трэба мець грошы. А тут усё бясплатна», — прызнаўся 15-гадовы чытач Павел Галімаў. Ён з ліку той тысячы пакрыўджаных чытачоў, якім бібліятэка на вуліцы Аўтазаводскай патрэбна.

Насамрэч атрымліваецца нейкі парадокс. Мы ўсе хвалюемся, што моладзь не імкнецца чытаць, што кніжкі пыляцца на паліцах крам, нават святы ладзім, каб звярнуць увагу на кнігу. Магілёў, які ганарова нёс званне культурнай сталіцы 2013 года, увесь год рыхтаваўся да Дня пісьменства ў Быхаве. Нават помнік летапіснаму выданню Баркулабаўскага летапісу ўсталявалі менавіта ў выглядзе кнігі, а не нейкага там электроннага носьбіта. На свяце шмат чаго добрага казалі пра кнігі, пра веды, пра тое, што мы застаёмся адной з самых чытаючых нацый. А праз месяц стала вядома пра закрыццё бібліятэкі. І не яна адна трапіла пад «аптымізацыю». Па інфармацыі аблвыканкама, за мінулы год на Магілёўшчыне ў выніку рэарганізацыі перастала існаваць каля 35 бібліятэк. А вось новай не адкрылася ніводнай. Ад работнікаў бібліятэк пастаянна чуваць скаргі на сумны стан галіны, на тое, што будынкі і кнігі прыходзяць у непрыдатнасць, зацікаўленых чытачоў становіцца ўсё менш, а фінансаванне скарачаецца.

«Без бібліятэкі школа нічога не можа зрабіць. Школа і бібліятэка — дзве родныя сястры». З хадайніцтва сялян аб адкрыцці бібліятэкі. 1910 г.

Але зламаць заўсёды прасцей, чым пабудаваць. Так лічыць і дырэктар адзінага ў краіне бібліятэчнага каледжа імя Пушкіна, які знаходзіцца ў Магілёве. «Пакуль праблем з працаўладкаваннем нашых выпускнікоў няма, — кажа Святлана Казлова. — Але калі справа і далей так пойдзе, то патрэба ў бібліятэкарах хутка знікне. Толькі хто ад гэтага выйграе? Сёння, нават пры ўсім развітым інфармацыйна-тэхналагічным асяроддзі, адбываецца катастрафічнае падзенне культурнага ўзроўню».

На думку Святланы Анатольеўны, гаворка павінна ісці не пра тое, каб закрываць бібліятэкі, а пра тое, каб шукаць новыя формы арганізацыі работы з чытачамі і насельніцтвам. Трэба не «зліваць» бібліятэкі ў адну, а ствараць на базе кожнай з іх інфармацыйна-культурныя цэнтры, клубы па інтарэсах або гурткі. Існуюць жа бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-музеі, нават бібліятэкі — пункты сацыяльнай дапамогі. І чым больш іх будзе, тым лепш.

Дарэчы, у магілёўскай школе № 34 правялі невялічкі эксперымент: паставілі на калідоры кніжную шафу і прапанавалі дзецям прынесці з дому кніжкі, каб іх маглі пачытаць і іншыя. І самае цікавае, што гэта мабільная бібліятэчка карыстаецца вялікай папулярнасцю. Кнігі на паліцах дарэмна не пыляцца. Іх з задавальненнем чытаюць і дзеці, і дарослыя. І няма розніцы, сучасная гэта літаратура або класіка.

Да ведама

Па даных Інстытута статыстыкі ЮНЕСКА, па колькасці бібліятэчных кніг на душу насельніцтва Беларусь (667 кніг на тысячу жыхароў краіны) знаходзіцца на 19-м месцы. Для параўнання, Расія — на 26-м (513), Украіна — на 55-м (88), ЗША — на 92-м.

А колькі людзей сабралася, калі ў мінулым лістападзе бібліятэка імя Івана Чыгрынава ў Касцюковічах пераехала ў новы будынак! У чытачоў было сапраўднае свята. Дзякуй абласному і раённаму кіраўніцтву, якое знайшло на рэканструкцыю ўстановы амаль 2,5 мільярда рублёў.

Аб адданых чытачах можа шмат расказаць і дырэктар магілёўскай дзіцячай бібліятэкі № 2 Святлана Равінская. Супрацоўнікі перад Новым годам паставілі ёлку і прапанавалі дзецям упрыгожыць яе лістамі з пажаданнямі ці прызнаннямі. Гэтыя напісаныя дзіцячай рукой радкі кранаюць сваёй непасрэднасцю і шчырасцю: «Калі мне было 8 гадоў, бацькі падарылі мне казкі Андэрсена. Я люблю чытаць іх перад сном і ўяўляць сябе галоўным героем»; «Я люблю кнігі, у якіх старонкі «зачытаны да дзірак». Аўтарытэт такіх кніг не аспрэчыць. Калі трымаеш іх у руках, ствараецца ўражанне, што ты становішся бліжэй да тых людзей, якія чыталі іх да цябе, перажывалі тыя ж эмоцыі, тыя ж пачуцці, што і ты цяпер. Ты, як і яны, падарожнік па старонках цікавых кніг»; «Электронная кніга ніколі не зможа замяніць мне друкаваны варыянт. Яе нельга памацаць, адчуць пах друкарскай фарбы, правесці пальцамі па літарах і адчуць іх контуры. Друкаваная кніга — гэта шэдэўр інтэлектуальнага мыслення чалавека»; «Я люблю знаходзіць у кнігах закладкі: абгорткі ад цукерак і шакаладак, і карткі ад розных гульняў. Часам гэта спецыяльна набытыя або зробленыя ўручную з розных матэрыялаў закладкі. Па іх можна меркаваць аб людзях, якія чыталі гэтыя кнігі: пра іх захапленні і прыхільнасці».

Мудрая Астрыд Ліндгрэн, «маці» ўсенародна любімага Карлсана, казала: «Тое, якім будзе свет заўтра, шмат у чым залежыць ад сённяшніх хлопчыкаў і дзяўчынак, тых, хто якраз цяпер вучыцца чытаць». Спецыялісты сведчаць, цікавасць да кнігі прыпадае на трэці клас, калі навык чытання толькі што набыты і яшчэ не згублены. І захаваць гэтую цікавасць на ўсё жыццё павінны ўсе разам — сям'я, школа, бібліятэка, грамадства.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

Гэта цікава

Па інфармацыі Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і ўстаноў, у свеце налічваецца больш за 569,6 тысячы бібліятэк. Больш за ўсё іх у Еўропе (звыш 440 тысяч) і ў Паўночнай Амерыцы (больш за 125 тысяч). У бібліятэках свету захоўваецца больш за 20 мільярдаў кніг і звыш 10 мільярдаў адзінак перыёдыкі.

Найбольш багатыя фонды бібліятэк Еўропы (больш за 16 мільярдаў адзінак захоўвання), Паўночнай Амерыкі (12 мільярдаў) і Азіі (1,5 мільярда). Абанентамі бібліятэк з'яўляюцца прыкладна 2,5 мільярда чалавек, прычым безумоўны лідар — Еўропа (1,8 мільярда чалавек).

■ Як нас дураць

ЗАМЕСТ ДОЎГУ... КАРОБКІ З ФАНЕРАЙ

Гісторыя пачалася з таго, што некалькі гадоў таму індывідуальны прадпрымальнік папрасіў у калегі па бізнесе грошай. У якасці пацверджання вяртання доўгу мужчына прапанаваў узяць у заклад яго машыну. Праз паўгода прадпрымальніку зноў тэрмінова спатрэбілася буйная сума грошай, і ён у чарговы раз звярнуўся да таварыша з просьбай пазычыць яму на два месяцы 25 тысяч долараў.

— Праўда, на гэты раз бізнесмен не змог аддаць у заклад свой аўтамабіль, як было ў мінулы раз, бо той знаходзіўся ў рамонце. У сувязі з гэтым мужчына прапанаваў узяць у яго дзесяць новых запакаваных ноўтбукаў, кошт якіх складаў 7 тысяч долараў, — паведаміла прэс-сакратар Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш. — Калі агавораны тэрмін скончыўся, бізнесмен не змог вярнуць доўг, бо ўкладзеныя ў справу грошы не прынеслі даходу. Даўжнік папрасіў калегу яшчэ некалькі месяцаў пачакаць.

У выніку гісторыя з вяртаннем грошай зацягнулася на год. І калі таварыш у чарговы раз пачуў, што бізнесмену патрэбна яшчэ адтэрміноўка, ён не вытрымаў: узяў ноўтбукі, пакінутыя ў заклад, і панёс іх у адзін з камп'ютарных цэнтраў, дзе прапанаваў супрацоўнікам набыць іх у яго. Калі праз некалькі хвілін адзін з супрацоўнікаў цэнтра вярнуўся, трымаючы ў руках каробку з-пад камп'ютара, яго абурэнню не было межаў. Мужчына-прадавец нічога не мог зразумець: чаму на яго крычыць... А калі зазірнуў у каробку, убачыў там... кавалкі фанеры.

Кожная дошка была акуратна выразана пад памер каробкі і важыла, як ноўтбук. Пацярпелы тут жа звярнуўся ў міліцыю. Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі аферыста, 31-гадовага прадпрымальніка. Напачатку той сцвярджаў, што не мае ніякага дачынення да махінацыі, але потым ва ўсім прызнаўся. Заведзена крымінальная справа. Затрыманы раскайваецца ў сваім учынку і абяцае вярнуць узятую ў доўг суму ў бліжэйшы час.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Тэма дня

ТРЫВОЖНЫ СТУДЗЕНЬ НА ДАРОГАХ

Кіроўцы і пешаходы: без відэакантролю парадку не будзе?

Дарожна-транспартныя здарэнні з цяжкімі наступствамі распачаліся ў Гродне неўзабаве пасля надыходу новага года, дакладней а 5-й гадзіне раніцы 1 студзеня: нецвярозы кіроўца збіў пешаходаў, юнака і дзяўчыну, якіх шпіталізавалі з пераломамі ног. А на наступны дзень у абласным цэнтры малады вадзіцель няправільна выбраў хуткасць, машына наскочыла на бардзюрны камень, перакулілася і ўдарылася ў асвятляльную апору. Хлопец, які ўсяго 4 месяцы таму атрымаў вадзіцельскія правы, памёр на месцы. І гэта быў толькі пачатак месяца...

«Пешаходы, будзьце ўважлівыя!».

«Звязда» ўжо паведамляла аб трагедыі на пешаходным пераходзе ў Гродне, дзе 15-тонным «КамАЗам» была смяротна траўміравана 13-гадовая дзяўчынка. І літаральна назаўтра — чарговае здарэнне: ад сутыкнення з аўтамабілем, які ехаў на зялёнае святло, атрымаў траўму 15-гадовы хлопец. На праезную частку ён выйшаў на забаронены сігнал светлафора і, да таго ж, быў у насунутым на галаву капюшоне.

А на наступны дзень у абласным цэнтры здарыліся яшчэ два ДТЗ, зноў жа на пешаходных пераходах. У адным выпадку пад коламі «Опеля» апынулася жанчына — прычым для абодвух удзельнікаў дарожнага руху гарэў зялёны сігнал святлафора. Кіроўца праігнараваў правіла, згодна з якім быў абавязаны прапусціць пешахода. А вось у другім выпадку ў сутыкненні з аўтамабілем, які ехаў на дазвольны сігнал святлафора, бачыцца віна пешахода. Прычым і жанчына была ў капюшоне і, верагодна, не заўважыла, што набліжаецца аўтамабіль.

Відэакамера на пешаходным пераходзе.

Дарэчы, адразу ж пасля гібелі дзяўчынкі пад коламі грузавіка Дзяржаўтаінспекцыя для кантролю за сітуацыяй на пешаходных пераходах пачала задзейнічаць відэафіксацыю. Вынікі не прымусілі сябе чакаць: на адным з пераходаў усяго за некалькі хвілін перасовачны відэакомплекс выявіў каля дзясятка парушэнняў — кіроўцы не прапускалі пешаходаў, стваралася пагроза аварый.

ДАІ папярэджвае, што ў розных месцах абласнога цэнтра, на найбольш аварыйных пешаходных пераходах штодзённа будуць выстаўляцца дзясяткі камер. Але пры гэтым раіць пешаходам задумацца, ці варта так прывычна карыстацца сваім законным правам на першачарговы пераход вуліцы?

Можа, лепш спыніцца і падумаць пра так званыя шалі? З аднаго боку — адказнасць кіроўцы за парушэнне правілаў і няхай нават самае жорсткае пакаранне, аж да пазбаўлення волі. А з другога — ваша здароўе і жыццё. Таму, выходзячы на праезную частку нават на дазваляльны сігнал святлафора, трэба ўсё роўна быць пільным і глядзець па баках.

Але вось сведчанне аднаго гродзенца, кіроўцы з вялікім стажам: «Нядаўна вырашыў правесці эксперымент, прастаяўшы 30 хвілін на пешаходным пераходзе. За гэты час на чырвонае святло дарогу перайшлі 23 чалавекі (толькі двое з іх — дзеці) і пры гэтым былі створаны 3 аварыйныя сітуацыі».

Відавочна, што штрафавацца па матэрыялах відэафіксацыі павінны не толькі незаконапаслухмяныя кіроўцы, але і парушальнікі — пешаходы. Безумоўна, камеры не заменяць галоўнага — узаемапавагі ўдзельнікаў дарожнага руху. Хаця і павінны садзейнічаць непазбежнасці пакарання, бо іншай «мовы» шмат хто не разумее.

Як, напрыклад, выхоўваць кіроўцу, які так захапіўся святкаваннем Новага года, што сеў за руль «падшафэ» 2,19 праміле алкаголю ў крыві? Хаця яшчэ і года не мінула, як ён затрымліваўся за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане. Вядома ж, такія асобы павінны пазбаўляцца «колаў», што цяпер і прадугледжана законам.

Увогуле з пачатку дзеяння такой заканадаўчай меры на Гродзеншчыне гэта ўжо трыццаты выпадак кіравання транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення паўторна на працягу года пасля адміністрацыйнага спагнання. Ёсць жаданне вучыцца на горкім вопыце іншых? Тады вось, да ведама, апошняе судовае рашэнне ў Гродне ў дачыненні да кіроўцы, які пасля першага пакарання (штраф 2 мільёны рублёў і пазбаўленне вадзіцельскіх правоў на 3 гады) зноў ехаў за рулём нецвярозым (экспертыза паказала амаль 9-разовае перавышэнне дапушчальнага ўзроўню алкаголю ў арганізме). Пакаранне: 2 месяцы арышту, штраф у памеры 250 базавых велічынь (32,5 мільёна рублёў) і канфіскацыя ў даход дзяржавы аўтамабіля «Сітраен Ксантыя», які, дарэчы, належыць жонцы парушальніка.

Добра яшчэ, што ў гэтых выпадках ад п'янага кіроўцы не пацярпелі іншыя ўдзельнікі дарожнага руху. Як гэта здарылася нядаўна непадалёк ад абласнога цэнтра ў вёсцы Саволеўка, дзе на роўным участку дарогі не раз'ехаліся два легкавікі. Відавочцы сцвярджаюць, што машыну віноўніка аварыі не раптоўна вынесла на сустрэчную паласу — рухаўся па ёй. А пасля аварыі паводзіў сябе так агрэсіўна, што прыйшлося яго звязаць. Пры гэтым вельмі п'яны кіроўца не атрымаў ніводнай драпіны, чаго не скажаш пра іншага ўдзельніка ДТЗ: яго шпіталізавалі з пераломамі рэбраў, грудзіны і іншымі траўмамі.

Дарэчы, урад Польшчы нядаўна ўзгадніў пакет рэкамендацый па барацьбе з п'янствам за рулём: мяркуецца назаўсёды пазбаўляць вадзіцельскіх правоў тых кіроўцаў, якія сталі віноўнікамі сур'ёзных дарожна-транспартных здарэнняў. І хіба ж гэта не справядліва?

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

■ Добрая навіна

ЭПІДЭМІЁЛАГАЎ ПЕРАСЯЛІЛІ З КАМФОРТАМ

Тры з паловай гады калектыў Чачэрскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі чакаў уваходзінаў у новае памяшканне. І вось нарэшце раённая ўстанова аховы здароўя, якая да апошняга часу размяшчалася ў мясцовай паліклініцы, набыла новы двухпавярховы будынак, які раней належаў прадпрыемству «Фармацыя».

Як паведамілі ў Гомельскім абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, на рэканструкцыю аб'екта з абласнога бюджэту было накіравана Br3,2 млрд. Акрамя таго, спонсарскую дапамогу аказалі ААТ «Звязда» (Br32 млн), КЖУП «Чачэрскае» (Br9,4 млн). Затое сёння збудаванне адпавядае самым высокім патрабаванням і стандартам. Светлыя кабінеты абсталяваны новай мэбляй і сучаснай аргтэхнікай. На сценах прыцягваюць увагу маляўнічыя інфармацыйныя стэнды. Мікрабіялагічная і санітарна-гігіенічная лабараторыі маюць магутнае выцяжное абсталяванне. Цяпер тут ёсць усё неабходнае для працы і правядзення профільных даследаванняў. У новым будынку для 30 супрацоўнікаў прадугледжаны пакоі для прыёму ежы, пераапранання, уласны санвузел, душавыя, а таксама пакой здаровага ладу жыцця, дзе ўсталяваны сучасныя трэнажоры для заняткаў фізкультурай у непрацоўны час. Змяніўся і фасад будынка. Наведнікам не прыйдзецца доўга шукаць Чачэрскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі: кірунак пакажуць вялікая шыльда з назвай і білборд, які прапагандуе здаровы лад жыцця.

— Сёння абноўлены будынак раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі адпавядае самым высокім патрабаванням і стандартам, магчыма, ён у ліку самых лепшых на Гомельшчыне, — адзначыў **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Гомельскай вобласці Аляксандр ТАРАСЕНКА**, які выказаў надзею, што адкрыццё добра абсталяванай установы, дзе створаны выдатныя ўмовы для працы, паспрыяе санітарна-эпідэміялагічнаму дабрабыту ў раёне.

Між тым, доўгачаканыя ўваходзіны адбыліся ў юбілейны для Чачэрска год — райцэнтр сёлета адзначыць 855-годдзе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■